ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№19(1052) | ЧАЦВЕР, 11 снежня 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## УНІВЕРСІТЭТЫ Ў XXI СТАГОДДЗІ

На базе МДУ імя М.В. Ламаносава адбылася другая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Універсітэты і грамадства. Супрацоўніцтва універсітэтаў у XXI стагоддзі", арганізатарам якой з'яўлялася таксама Еўразійская асацыяцыя універсітэтаў (ЕАУ) (яна аб'ядноўвае вядучыя класічныя універсітэты краін СНД, Расіі і іншых дзяржаў). Канферэнцыя прысвячалася 250-гадоваму юбілею МДУ.

Ва ўмовах сучаснага развіцця, калі ўзмацняецца значэнне фундаментальнай адукацыі, адзінства адукацыі і навукі, паскараюцца працэсы глабалізацыі ў грамадстве, значна ўзрастае роля універсітэтаў. Аб гэтым і ішла размова на канферэнцыі, прадстаўніцтва на якой было надзвычай шырокім: у ёй прымалі ўдзел адказныя асобы дзяржаўных структур, міністры, рэктары, прарэктары, выкладчыкі, студэнты, прафсаюзныя лідэры універсітэтаў-членаў ЕАУ. На пленарным пасяджэнні, якое адкрыў і вёў рэктар МДУ, Старшыня ЕАУ В.А. Садоўнічы, у 10-ці секцыях было заслухана і абмеркавана звыш 250 дакладаў і паведамленняў па самых розных аспектах жыццядзейнасці універсітэтаў не толькі постсавецкай прасторы, але і краін далёкага замежжа – Кітая, Германіі, Польшчы.

У склад беларускай дэлегацыі ўваходзілі першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А.І. Жук, рэктар БДУ, старшыня Савета па супрацоўніцтву ў галіне адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД В.І. Стражаў, кіраўнікі і вядучыя вучоныя Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка, Беларускай дзяржаўнай сельгасакадэміі, Гродзенскага, Магілёўскага дзяржуніверсітэтаў. Наш універсітэт прадстаўлялі старшыні прафкамаў супрацоўнікаў і студэнтаў Г.І. Варатніцкі і Н.І. Колтышава.

Удзельнікі канферэнцыі прынялі рэзалюцыю, у якой намечана ажыццяўляць паслядоўныя дзеянні, накіраваныя на павышэнне ролі універсітэтаў у жыцці грамадства на аснове паляпшэння якасці фундаментальнай адукацыі, узмацнення сувязі адукацыі з навуковымі даследаваннямі, каардынацыі сумеснай дзейнасці універсітэтаў ЕАУ, супрацоўніцтва іх прафсаюзных арганізацый, умацавання сувязей з ВНУ іншых дзяржаў.

Выдадзены зборнік матэрыялаў канферэнцыі, у які ўключана таксама даклад Ганаровага прафесара ГДУ, прафесара кафедры вышэйшай матэматыкі М.В. Селькіна "Роля перыферыйнага класічнага універсітэта ў фарміраванні рэгіянальнай палітыкі ў галіне навукі і адукацыі".

## ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ

Напярэдадні 60-годдзя вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбылася незабыўная сустрэча студэнтаў I курса філфака з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны: палкоўнікам у адстаўцы кандыдатам педагагічных навук Сямёнам Фёдаравічам Шакаравым і доктарам медыцынскіх навук, Ганаровым прафесарам ГДУ, падпалкоўнікам медыцынскай службы, удзельнікам баёў на граніцы ў 1941 г., Ганаровым пагранічнікам Рэспублікі Беларусь Аляксеем Савельевічам Калугіным.

Гасцей цёпла прыняў нам. дэкана факультэта Л.П. Кузьміч, які выказаў думку аб тым, што такія сустрэчы будуць наладжвацца пастаянна, а не толькі напярэдадні знамянальных дат.

Сустрэчу з ветэранамі адкрыла і прадставіла іх студэнтам дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Т.І. Язэпава.

Расказы аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, непасрэднымі ўдзельнікамі якіх былі паважаныя госці, пакінулі глыбокі след у сэрцах студэнтаў.

Юнакі і дзяўчаты пранікнёна чыталі вершы аб вайне. Завяршылася сустрэча ўручэннем ветэранам букетаў алых гваздзікоў, сумесным з моладдзю фотаздымкам.

С.Ф. Шакараў падараваў на памяць сваю кнігу "Героі Савецкага Саюза, поўныя кавалеры ордэна Славы Гомельшчыны".

**Н. ГЕНУК,**
**студэнтка I курса філфака.**

## "ВЕЛІЧ НАРОДНАГА ДУХУ"

Так называлася навукова-практычная канферэнцыя, арганізаваная Гомельскай гарадской арганізацыяй грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства "Веды". Яна прысвячалася 60-годдзю вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і праводзілася ў грамадска-культурным цэнтры.

У фае канферэнц-залы была арганізавана выстаўка матэрыялаў і экспанатаў Гомельскіх архіва і краязнаўчага музея, фотаматэрыялаў, дакументы з асабістых архіваў удзельнікаў канферэнцыі.

У ёй прынялі ўдзел лектары таварыства "Веды" – выкладчыкі нашага універсітэта: прарэктар па выхаваўчай рабоце А.В. Лысянкоў, д.ф.н. В.С. Новак, дацэнты А.Я. Рычкоў, Т.І. Язэпава, аўтар гэтых радкоў, Т.В. Аўдоніна, ст. выкладчыкі М.Я. Цішкевіч, В.Ф. Сеніна, асістэнт Т.В. Каралёва.

Вялікую цікавасць выклікалі даклады — А.Я. Рычкова "Цэнасны вобраз беларускай дзяржавы ў свядомасці навучэнцкай і студэнцкай моладзі Гомельшчыны", Т.І. Язэпавай "Моладзь Гомельшчыны ў барацьбе з фашысцкімі акупантамі", Т.В. Аўдонінай "Радавыя" Аляксея Дударава на сцэне Гомельскага аблдрамтэатра" і інш.

**І. ЭСМАНТОВІЧ,**
**старшыня універсітэцкай арганізацыі таварыства "Веды".**

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Яго чарговае пасяджэнне адбылося 27 кастрычніка. Першым на парадку дня былі абмеркаваны вынікі ўступных экзаменаў ва універсітэт на 2003-2004 навучальны год, намечаны і задачы па арганізацыі новага набору. З інфармацыяй выступіў адказны сакратар прыёмнай камісіі С.А. Хахомаў. Як адзначалася, у ГДУ было пададзена па дзённай форме навучання (бюджэтнай і платнай) 2440 заяў ад абітурыентаў, па завочнай – 1488. Звыш 2360 чалавек удзельнічалі ў тэсціраванні. Улік яго вынікаў дазволіў сэканоміць звыш 15% фонду пагадзіннай аплаты працы па выніках уступных экзаменаў. За час правядзення ўступнай кампаніі не было пададзена ніводнай апеляцыі. У многім гэта тлумачыцца ўвядзеннем дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў.

Аб выніках атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта далажыў вучоны сакратар В.Ю. Залатарэнка. У адпаведнасці з прынятым Палажэннем аб атэстацыі яе павінны былі прайсці 314 чал., з іх не атэставаны 8 чал. па прычынах хваробы, водпуску і звальнення.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р. Ліна зацверджана рашэнне аб вылучэнні для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне прэмій Гомельскага аблвыканкама для падтрымкі найбольш таленавітых маладых вучоных і спецыялістаў 6 навуковых даследаванняў і распрацовак выкладчыкаў ГДУ.

Зацверджана рашэнне навукова-метадычнага Савета універсітэта аб прыёме залікаў, з якім членаў Савета азнаёміў нам. старшыні НМС, дэкан завочнага факультэта М.Н. Мурашка (рэкамендацыі апублікаваны ў сённяшнім нумары нашай газеты на 2-й стар.).

Начальнік НДС В.Р. Сафонаў расказаў аб магчымасцях удзелу выкладчыкаў універсітэта ў Дзяржаўнай праграме развіцця сацыяльна-гуманітарных навук на 2003-2005 гг.

Унесены змяненні ў Статут універсітэта, аб прыёме ў дактарантуру ГДУ праінфармавала загадчыца аспірантуры С.Ф. Зобава.

На вакантныя пасады выбраны і перавыбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў: загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін В.М. Храмчанкова, асістэнт кафедры педагогікі С.А. Вальчанка перавыбраны на гэтыя ж пасады на новы тэрмін, загадчык кафедры оптыкі А.М. Сердзюкоў абраны на пасаду прафесара гэтай жа кафедры, дацэнт кафедры агульнай фізікі С.А. Хахомаў – загадчыка кафедры оптыкі, дацэнт В.С. Новак – прафесара кафедры беларускай літаратуры.

На Савеце разгледжаны таксама іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ПЕРАМОЖЦЫ

***Да ўдзелу ў агульнауніверсітэцкім конкурсе плакатаў і малюнкаў, прысвечаным Сусветнаму дню барацьбы са СНІДам, студэнты фізічнага факультэта аднесліся вельмі адказна і творча. Вынік адпаведны – яны занялі першае месца.***

**(Матэрыял аб конкурсе чытайце на 4-й стар. газеты).**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**




## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці асістэнт кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання **БАГДАНАВА Таццяна Рыгораўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

За працяглую і плённую навукова-даследчую работу, звязаную з распрацоўкай лазернага абсталявання і лазерных тэхналогій, паспяховае выкананне навукова-тэхнічных праграм, укараненне ў вытворчасць іх вынікаў і ў сувязі з 55-годдзем з дня нараджэння загадчык НДЛ "Оптыка-электронныя сістэмы кіравання лазерным прамнем" старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага сектара **МАЛАШЧАНКА Аляксей Цярэнцьевіч** узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

## Акцыя: І ВАШАЙ ДУШЫ ЧАСЦІНКА...

Да Новага года – самага любімага ўсімі свята – яшчэ шмат часу. Але ў выставачнай зале універсітэта прыгожая лясная госця ўжо заняла сваё пачэснае месца і запрашае выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў завітаць сюды, дзе створана адпаведная навагодняя атмасфера. Тут распачалася традыцыйная акцыя людской дабрыні, спагады, у час якой усе жадаючыя могуць прыносіць да зялёнай прыгажуні цацкі, кнігі, канцылярскія прыналежнасці, падарункі, якія потым Дзед Мароз са Снягуркай уручаць дзецям са шматдзетных сем'яў, дзецям-інвалідам, выхаванцам дзіцячых дамоў-інтэрнатаў і г.д.

Прафкамы супрацоўнікаў, студэнтаў, Савет жанчын універсітэта звяртаюцца да ўсіх з просьбай прыняць удзел у гэтай высакароднай справе.

## Навіны кароткім радком

### НОВЫ СТАРШЫНЯ

Напярэдадні 60-годдзя вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на свой чарговы сход збіраліся ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія працавалі ці працягваюць яшчэ працаваць у нашым універсітэце. Акрамя абмеркавання актыўнага ўдзелу ў святкаванні знамянальнай у жыцці абласнога цэнтра даты, сустрэч са студэнцкай моладдзю ГДУ яны разгледзелі таксама арганізацыйнае пытанне. Палкоўніка ў адстаўцы А.А. Косцікава, які ўзначальваў Савет ветэранаў, па яго ўласнай просьбе вызвалілі ад выканання гэтых абавязкаў. Новым старшынёй аднагалосна абраны палкоўнік у адстаўцы М.П. Шкарбун.

### ВІЗІТ ФРАНЦУЗАЎ

З кароткатэрміновым візітам у ГДУ знаходзіліся выкладчыкі Оверньскага універсітэта Філіп Гітар, Мікалай Чэрнеў разам з садырэктарам Франка-беларускага інстытута кіравання Морысам Шэневуа. Яны правялі заняткі для студэнтаў сумеснай навучальнай установы.

### НАМ ДАПАМАГАЮЦЬ

Праз дабрачынны фонд "Дзеці Чарнобыля" ва універсітэт у лістападзе паступіла гуманітарная дапамога з Бельгіі. Звыш 90 чалавек згодна пададзеных у прафкам ГДУ спісаў ад старшынь прафсаюзных бюро факультэтаў, іншых структурных падраздзяленняў атрымалі адзенне, абутак, пасцельныя прыналежнасці і інш.

### АБ СВАБОДНА КАНВЕРТУЕМАЙ АДУКАЦЫІ

У ГДУ адбылася прэзентацыя магістэрскай праграмы па эканоміцы Кансорцыума эканамічных даследаванняў і адукацыі (EERC) Нацыянальнага універсітэта "Кіева-Магілянская Акадэмія" (Кіеў, Украіна). У канферэнц-зале з дэканамі факультэтаў, загадчыкамі кафедр, студэнтамі сустрэліся доктар эканомікі са сталічнага універсітэта Бельгіі, дырэктар даследчага цэнтра EERC Том Купэ і вядучы спецыяліст па акадэмічных пытаннях Аксана Заваліна. Яны расказалі аб магчымасцях атрымання беларускімі студэнтамі пры фінансавай падтрымцы Міністэрства замежных спраў Швецыі бясплатнай адукацыі, якасць якой адпавядае самым высокім міжнародным стандартам.

## "ДУША ХАЦЕЛА Б БЫЦЬ ЗОРКАЙ"

У Гомельскім грамадска-культурным цэнтры праведзены літаратурна-мастацкі вечар, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага паэта Фёдара Цютчава. Актыўны ўдзел у яго падрыхтоўцы і правядзенні прынялі загадчык кафедры рускай літаратуры к.ф.н., дацэнт Л.Л. Ермакова, якая з'яўлялася адным з аўтараў сцэнарыя вечарыны, а таксама студэнты другога курса філфака С. Мацькунова, Д. Карака, І. Любезная, А. Крахмальнік. Яны натхнёна чыталі вершы вялікага паэта.

Гомельскі універсітэт 11 снежня 2003 г.

**Сама История распорядилась так, что судьбы Гомельщины и Черниговщины неразделимы. Корни этого единства уходят в глубину веков. Тысячу лет назад восточную Гомельщину населяли радимичи, а Черниговщину — северяне. Еще в начале XII столетия летописец заметил, что те и другие имели одинаковые обычаи. Отнюдь не случайно предки гомельчан и черниговцев построили вместе с другими славянами государство Киевская Русь, разделили тяжелую участь монголо-татарского нашествия, пережили время кровавых раздоров эпохи средневековья, гражданских войн и революций. А затем — вновь и вместе — строили и созидали.**

# ВОССТАНАВЛИВАЮТСЯ НАУЧНЫЕ СВЯЗИ С УКРАИНОЙ

После распада Советского Союза научные и культурные связи между Гомельщиной и Черниговщиной заметно ослабли. А ведь до этого наш университет готовил десятки студентов-историков для г. Чернигова и Черниговской области, существовали устойчивые научные связи между краеведами, историками и археологами двух регионов, постоянно проводились совместные историко-краеведческие конференции. От этого была большая польза для подготовки кадров, развития научного потенциала братских Беларуси и Украины.

Бурная эпоха перемен 1990-х годов закончилась, и вновь многое возвращается «на круги своя». Восстанавливается нужное, полезное, взаимовыгодное, отбрасывается второстепенное и наносное. Отнюдь не случайно, что гомельские студенты-историки оказались «первопроходцами» в деле возрождения порушенных было культурно-научных связей с ближайшим нашим соседом - Украиной.

В Черниговском госпедуниверситете им. Т. Шевченко состоялась 2-я Международная студенческая археологическая конференция, организованная нашими украинскими коллегами при содействии Национальной Академии наук Украины. Ее участниками были студенты Украины (Киев, Чернигов, Львов, Черновцы и др.), России (Воронеж, Брянск), Канады (Торонто). Беларусь была представлена более чем скромно, всего тремя докладчиками. Но радует то, что двое из них – наши, гомельские студенты-историки, углубленно изучающие проблемы средневековой археологии. Аудиторию напутствовал проректор по научной работе ЧГПУ им. Т.Шевченко профессор В.А.Дятлов, тепло приветствовали член-корреспондент НАН Украины П.М.Торяков, глава Оргкомитета - зав. кафедрой истории и археологии Украины ЧГПУ им. Т. Шевченко В. П. Коваленко, зав. отделом средневековой и древнерусской археологии Института археологии НАН Украины А.П. Моця. Репортажи об открытии конференции показали по нескольким телеканалам Украины, а о результатах ее работы - сообщили в прессе.

Высокий уровень состоявшейся конференции определился не только географией стран-участниц, но и глубиной, характером тематики прозвучавших научных докладов и сообщений. Так, они касались кельто-славянских культурных контактов, мировоззрения средневековых воинов-наемников, истории и археологии городов Южной Руси и соседних территорий XX-XIV веков, интерпретации магических знаков на предметах из археологических раскопок, истории средневекового военного искусства, характеристики погребального обряда славян и их соседей, исследования восточнославянского язычества и многих других проблем.

Наш университет достойно представлял доклад студентов Романа Лосева и Анны Тимофеенко - членов научного общества «ТАмГА», действующего на историческом факультете. Он был посвящен первым итогам археологического изучения средневекового могильника близ деревни Шарпиловка Гомельского района. Международная аудитория заслушала информацию наших студентов о характере славянского погребального обряда и важнейших археологических находках экспедиции ГГУ, сделанных в процессе практик-экспедиций 2001-2002 годов. Черниговским археологам и будущим специалистам из числа местных студентов это было тем более интересно, потому что Шарпиловский археологический комплекс размещается на порубежье Беларуси и Украины – там, где не только проходят государственные границы, но и соединяются научные интересы современных историков, где требуется обоюдное внимание к нашему общему прошлому. На конференции звучала украинская, русская, белорусская, английская речь. Но никто из участников научного мероприятия языковых барьеров не заметил.

Студенты-историки привезли не только теплые воспоминания о гостеприимной Украине, но и реальное подтверждение итогов своей творческой командировки – увесистый сборник научных трудов, в котором их сообщение занимает достойное место. Но на этом наши будущие археологи не успокоились: они решили поддержать и другие начинания черниговских соседей.

(Окончание на 4-й стр.)

# К СЕССИИ – С ГОТОВНОСТЬЮ

## *Рекомендации по проведению зачетов*

**Рассмотрены и одобрены на заседании секции учебно-методической документации и учебной литературы научно-методического совета университета 25 ноября 2003 года, протокол № 2.**

**Обсуждены и утверждены на заседании НМС университета 26 ноября, протокол № 2, на заседании Совета университета 27 ноября, протокол № 4.**

Зачеты, как правило, служат формой проверки успешного выполнения студентами лабораторных, расчетно-графических, курсовых работ /проектов/, усвоения учебного материала практических и семинарских занятий, а также формой проверки прохождения учебной и производственной практики и выполнения в процессе этих практик всех учебных поручений в соответствии с утвержденной программой.

В отдельных случаях зачеты могут устанавливаться как по дисциплине в целом, так и по отдельным ее частям.

Зачеты по дисциплине или по ее части должны проводиться в полном соответствии с «Положением о курсовых экзаменах и зачетах в высших учебных заведениях», утвержденным приказом Министра образования Республики Беларусь №235-А от 22.08.1994 г.



Студенты обязаны сдать все зачеты в полном соответствии с учебными планами и утвержденными программами, едиными для студентов дневных, вечерних и заочных форм обучения высших учебных заведений.

Студенты могут сдавать зачеты по факультативным дисциплинам, практикумам и семинарам, и, по их желанию, результаты сдачи вносятся в экзаменационно-зачетную ведомость, зачетную книжку и в выписку из экзаменационно-зачетной ведомости / приложение к диплому/.

Студенты, которым в порядке исключения разрешен в пределах общего срока обучения индивидуальный график занятий, могут сдавать зачеты в межсессионный период в сроки, установленные деканатами факультетов.

Студентам заочной формы обучения разрешается по мере готовности сдавать зачеты по любой дисциплине, изучаемой на соответствующем курсе, независимо от других дисциплин.

Студенты дневной и вечерней форм обучения допускаются к экзаменационной сессии при условии сдачи всех зачетов, предусмотренных учебным планом, выполнения и сдачи установленных расчетно-графических и других работ по дисциплинам учебного плана текущего семестра.

При явке на зачет студент обязан иметь документ, подтверждающий его личность, и зачетную книжку.

Зачеты принимаются преподавателями, проводившими практические занятия либо читавшими лекции по данному курсу. Присутствие на зачете посторонних лиц без разрешения ректора, проректора по учебной работе или декана не разрешается.

Зачеты по практическим и лабораторным работам принимаются по мере их выполнения. По отдельным дисциплинам зачеты могут проводиться в форме контрольных работ на практических занятиях.

Зачеты по семинарским занятиям могут выставляться на основании рефератов (докладов) или других выступлений студентов на семинарах.

Зачеты по дисциплинам, по которым учебным планом предусмотрены только лекционные занятия, могут проводиться после окончания изучения дисциплины. Зачеты в данном случае проводятся в форме собеседования. Вопросы, выносимые на зачет, должны быть утверждены на заседании кафедры и доведены до сведения студентов.

Содержание вопросов должно соответствовать учебной программе дисциплины учебного плана и отражать основные вопросы лекционных занятий.

При проведении зачетов в форме собеседования должна соблюдаться установленная нормами средняя продолжительность зачета для группы студентов: из расчета до 15 минут на одного студента.

По решению Совета университета перед экзаменационной сессией на факультете может быть проведена зачетная неделя.

Учебная практика студентов засчитывается преподавателями на основании отчетов, составленных студентами в соответствии с утвержденной программой. Зачет по производственной (педагогической) практике ставится на основании итогов защиты студентами отчетов перед специальной комиссией, созданной кафедрой с участием руководителей производственной (педагогической) практики.

Зачеты по курсовым работам /проектам/ выставляются на основании итогов защиты студентами курсовых проектов /работ/ перед специальной комиссией, созданной кафедрой, с участием руководителя /проекта /.

Итоги сдачи зачетов оцениваются отметкой «зачтено», «незачтено». Зачет с дифференцированными отметками / «отлично», «хорошо», «удовлетворительно», «неудовлетворительно»/ выставляется по курсовым работам /проектам/, производственной (педагогической) практике.

Студенту, не явившемуся на зачет к началу экзаменационной сессии, в зачетно-экзаменационной ведомости выставляется отметка "не явился".

Зачетно-экзаменационная ведомость по дневной форме обучения сдается в деканат в день принятия зачета и закрывается к началу экзаменационной сессии.

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Для поэтапной дифференцированной объективной оценки всех видов учебной работы студентов, изменения мотивации избежания неудач на достижение успеха, повышения качества знаний целесообразно введение рейтинговой системы учебной деятельности. Рейтинговая система обсуждается на заседании кафедры, методического совета факультета.

# О РАЗРАБОТКЕ ПРОЕКТА ГЕРБА ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛАСТИ

**В целях пропаганды и сохранения исторического и культурного наследия, учитывая общественно-политическую и воспитательную значимость собственной символики области, отражающей национальные исторические корни и традиции, преемственность поколений, Гомельский облисполком счел необходимым учредить герб Гомельской области.**

Решением облисполкома от 24 сентября 2003 г. №614 создана временная творческая группа для разработки проекта герба области для последующей геральдической экспертизы в Геральдическом Совете при Президенте Республики Беларусь.

Учитывая значимость проекта, предлагаем вносить свои предложения по созданию герба области в облисполком **до 20 декабря 2003 г.** с пометкой на конверте «герб области».

Основой герба должен быть геральдический щит; цвета, их сочетание и повороты фигур должны соответствовать гербоведческим нормам. Необходимо избегать дробления щита на несколько отдельных композиций, никак не связанных общими элементами, помещения в гербе атрибутов новейшего времени, изображений конкретных сооружений и предметов, надписей.

Одновременно просим представлять описание эскиза предложенного варианта герба Гомельской области.

Все проекты будут рассмотрены Гомельским областным исполнительным комитетом.

**Творческая группа при облисполкоме по разработке проекта герба Гомельской области.**

Конференции

# ЗА РАМКАМИ СТАНДАРТОВ

На базе кафедры социальной и педагогической психологии проведена конференция «Современные образовательные технологии». Ее участниками были лучшие учителя средних школ г. Гомеля, а также преподаватели и студенты специальности «Психология» нашего университета.

На семинаре рассматривались технологии проблемного обучения (интерактивный подход), ТРИЗ (творческое решение изобретательских задач). Проблему реализации интегративного подхода в проблемном обучении представляла учитель русского языка и литературы СШ №10 Елена Александровна Подрубная. Она продемонстрировала эффективность данного подхода, непосредственно показав на конференции мини-урок по произведению А.П. Чехова «Человек в футляре» **(на снимке)**. У студентов это вызвало огромный интерес, они активно участвовали в занятии.



Технологию ТРИЗ представляла педагог СШ №51 Светлана Ивановна Гин – инициатор создании создания экспериментального класса, в котором ученики в течение 6 лет обучаются по данной методике. Ее важной особенностью является то, что данная технология предполагает не только успешное освоение теоретических знаний, но и приложение этих знаний к реальным жизненным проблемам, что, к сожалению, зачастую упускается классическим образованием. Главный метод ТРИЗ – постановка перед учащимися так называемых открытых проблем, позволяющих им искать и находить множество нестандартных, оригинальных решений, переживая «ага-озарения». А это, в свою очередь, способствует развитию мышления, воображения.

Свое видение внедрения современных технологий в вузовское образование предложили участники психологического театра «Роза ветров». Ребята показали спектакль, состоящий из двух частей. Первая отображала модель занятия, которую чаще всего можно наблюдать в стенах университета: лекция, монотонно читаемая преподавателем, рефераты на основе скопированной странички из энциклопедии, спящие студенты на последних партах и постоянное ожидание звонка. А вторая часть – занятие, о котором многие студенты просто мечтают. Оно предполагает обсуждение с преподавателем и товарищами по группе самостоятельно изученного материала в свободной обстановке. Участники психологического театра уверены: если бы занятия проводились таким образом, «коэффициент полезного действия» вузовского обучения стал бы намного выше.

Большой интерес к данному вопросу со стороны студентов и педагогов обусловлен его актуальностью в настоящее время. Заведующая кафедрой социальной и педагогической психологии Г.В. Гатальская в своем выступлении отметила, что в дальнейшем планируется сделать проведение семинаров и конференций по современным образовательным технологиям для психологов традиционными. Действительно, это важно и для тех, кто уже работает в сфере образования, и для тех, кто спустя год-два вольется в эту сферу.

**Н. КРУКОВСКАЯ,**
**студентка 4 курса специальности «Психология».**

